ресурс]. — Режим доступа: http://www.nastaunik.info/node/14648. — Дата доступа: 20.10.2019.

4. Запрудский, Н.И. НаШтоБуЗУ — инструмент для объективной оценки успехов учащегося / Н. Запрудский / [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.nastaunik.info/node/14760. — Дата доступа: 20.10.2019.

5. Запрудскі, М.І. Актыўная ацэнка – новая стратэгія навучання / М.І. Запрудскі // Кіраванне ў адукацыі — 2011. — № 12.

6. Лукашенко, С.Э. Организация целеполагающей деятельности в 1 — 4 классах: 30 вопросов и ответов / С.Э. Лукашенко. — Минск : Адукацыя і выхаванне, 2015. — 184 с.

7. Шакура, С.Д. Формирование контрольно-оценочных действий учащихся 1 – 6 классов в процессе учебной деятельности / С.Д. Шакура. — Минск: АПО, 2011. – 112 с.

# ЭФЕКТЫЎНЫЯ ЎМОВЫ РАЗВІЦЦЯ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ НАВУЧЭНЦАЎ

Волкава Вольга Валер'еўна

***Анатацыя.*** *Артыкул прысвечаны тэме развіцця творчых здольнасцей навучэнцаў, пытанням арганізацыі адукацыйнага працэсу ў пачатковых класах, стварэння ўмоў для паспяховага развіцця дзіцяці.*

У апошнія гады востра абазначылася патрэбнасць грамадства ў творчых людзях, якія маюць нестандартны погляд на праблемы, здольныя адэкватна і своечасова рэагаваць на падзеі, што адбываюцца ў пастаянна зменлівым свеце. У сувязі з гэтым павышаецца роля агульнаадукацыйных школ у выхаванні актыўных, ініцыятыўных, творча думаючых людзей.

Творчыя магчымасці закладваюцца ў дзецях з нараджэння і развіваюцца па меры іх сталення. Прырода шчодра надзяляе кожнага чалавека здольнасцю развівацца. Кожны малы можа ўзняцца на вяршыню творчай дзейнасці, і дарослым неабходна дапамагчы яму гэтага дасягнуць.

Творчасць — гэта дзейнасць, вынікам якой з'яўляецца стварэнне новых матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей.

Я.А. Панамароў распрацаваў універсальнае вызначэнне творчасці, якую разумеў, як „... узаемадзеянне, што прыводзіць да развіцця“ [3, с. 54].

У педагогіцы і псіхалогіі тэрмін „творчасць“ вывучаецца ў кантэксце паняцця „творчая дзейнасць“. Унікальная творчая дзейнасць з'яўляецца спецыфічнай формай узаемадзеяння, а ў якасці крытэрыю творчасці выступае механізм развіцця. Зыходзячы з гэтага вызначэння, механізмам развіцця творчых здольнасцей дзяцей з'яўляецца арганізацыя спецыфічных формаў узаемадзеяння дзіцяці з дарослым у працэсе розных відаў дзейнасці [1].

Патэнцыйная геніяльнасць жыве ў кожным, і задача настаўніка — развіваць творчыя сілы ў маленькім чалавеку. Пачынаць развіццё дзяцей трэба як мага раней. Навукоўцы даследавалі дашкольнікаў малодшых узростаў і пераканаліся: чым маладзейшымі былі дзеці, тым бліжэй яны былі па развіцці, тым менш адрозніваліся адзін ад аднаго. Калі мы хочам дасягнуць высокіх вынікаў у развіцці дзіцяці, пачынаць трэба з перыяду ранняга дзяцінства, нават з нованароджанасці. Дзяцінства — непаўторная пара хуткага станаўлення, росту разумовых сіл. Усім здаровым дзецям уласціва разумовая актыўнасць, патрэба ў разумовых ураҗаннях і разумовых намаганнях. Дзіцяці ўласцівы цікавасць да навізны, імкненне паспрабаваць, выпрабаваць. Ужо пры пераходзе ад перыяду нованароджанага да маленства ў дзіцяці пачынае развівацца пазнавальная актыўнасць: малеча выяўляе гатоўнасць углядацца, услухоўвацца, ён адчувае патрэбу ў знешніх ураҗаннях.

Магчымасць развівацца не застаецца нязменнай. Якасныя адрозненні, розніца ў прадуктыўнасці разумовай працы развітых і адсталых у развіцці дзяцей бывае велізарнай. Гэта можна растлумачыць тым, што паміж клеткамі мозгу задзейнічана вялікая колькасць сувязяў. Кожнае дзіця мае ад нараджэння найбагацейшую кудзелістую сетку, якая злучае клеткі мозгу, але гэта толькі патэнцыйныя, магчымыя сувязі. Рэальнымі, дзеючымі яны становяцца тады, калі ў ход запускаюцца пэўныя нервовыя структуры, калі пачынаюць функцыянаваць тыя ці іншыя здольнасці і па „лініях сувязі“ пачынаюць праходзіць біятокі. Чым маладзейшае дзіця, тым навучанне праходзіць лягчэй, а з узростам гэта адбываецца нашмат цяжэй. Б.П. Нікіцін назваў гэту з'яву нуверсом — незваротнае згасанне магчымасцяў эфектыўнага развіцця здольнасцей. Мозг патрабуе для свайго поўнага развіцця, асабліва на ранніх стадыях, не толькі адпаведнага харчавання, але і стымуляцыі. Нейроны, пазбаўленыя любога з гэтых фактараў, асабліва стымулюючага «вучэбнага» асяроддзя, не могуць фармаваць багатую

сетку кудзелістых злучэнняў і, у канчатковым выніку, атрафуюцца. Вось чаму не атрымалася навучыць гаварыць дзяцей, якія выраслі ў логаве жывёл.

Магчымасці развіцця здольнасцей, дасягнуўшы максімуму ў „момант паспявання", не застаюцца нязменнымі. Калі яны не патрэбныя, адпаведныя магчымасці не развіваюцца, не функцыянуюць, і дзіця не ўключаецца ў пэўную дзейнасць, то творчыя здольнасці пачынаюць губляцца, дэградаваць. Калі жыццё дзіцяці зведзена да біялагічнага існавання (накормлены, напоены, пакладзены спаць), то рэалізуецца толькі невялікая частка яго магчымасцей, узнікае абмежаваная колькасць сувязей паміж клеткамі мозгу.

Такім чынам, першая ўмова паспяховага развіцця творчых здольнасцяў — ранні пачатак. Першыя імпульсы да развіцця здольнасцей пачынаюцца з ранняга фізічнага развіцця. Ранняе чытанне, ранняе ацэньванне, ранняе знаёмства і праца з рознымі інструментамі і матэрыяламі таксама даюць імпульс развіццю здольнасцей, прычым самых розных.

Здольнасці развіваюцца больш паспяхова, калі чалавек найчасцей у сваёй дзейнасці дасягае мяжы сваіх магчымасцей і паступова пашырае гэтыя межы. Парадаксальна, але гэта ўмова максімальнага напружання сіл лягчэй за ўсё ажыццяўляецца тады, калі дзіця ўжо поўзае, але яшчэ не пачало гаварыць. Працэс пазнання свету ў гэты час ідзе вельмі інтэнсіўна, але вопытам дарослых не скарыстаешся: растлумачыць такому маленькаму яшчэ нічога нельга. У гэты час малеча больш, чым калі-небудзь, вымушаны займацца творчасцю, вырашаць многія, для яго зусім новыя задачы, самастойна і без папярэдняга навучання, калі, вядома, дарослыя дазваляюць гэта рабіць, а не вырашаюць іх за яго.

Наступная важная ўмова – неабходнасць свабоды, прадстаўленай дзіцяці ў выбары дзейнасці, у чаргаванні спраў, у працягласці заняткаў адной якой-небудзь справай, у выбары спосабаў працы. Тут жаданне дзіцяці, яго цікавасць, эмацыйны ўздым служаць надзейнай гарантыяй таго, што нават вялікае напружанне розуму пойдзе малому на карысць. Але прадстаўленая дзіцяці свабода не толькі не выключае, а наадварот, мяркуе ненадакучлівую, разумную, добразычлівую дапамогу дарослых. Складанасць заключаецца ў тым, каб не ператвараць дапамогу ў падказку. Нельга рабіць за дзіця тое, што ён сам можа зрабіць, нельга думаць за яго, калі ён сам можа дадумацца.

Гады дзяцінства характарызуюцца рухомасцю ўяўлення, няспыннымі творчымі спробамі. Навізна адчуванняў, гульні і заняткі патрабуюць праяўлення ад дзіцяці інтуіцыі і вынаходлівасці, жыццёва неабходныя дзецям. Высокая творчая актыўнасць выяўляецца ў лёгкасці і шматвектарнасці думкі, незвычайных меркаваннях. Тое, што ў дзяцей часам узнікаюць нечаканыя супастаўленні і абагульненні, нараджаюцца асобыя прадукты мыслення, якія адрозніваюцца арыгінальнасцю, хутчэй за ўсё тлумачыцца недахопам у іх замацаваных спосабаў аналізу, гатовых штампаў. Усё гэта таксама можна лічыць дзіцячымі творчымі праявамі, калі мець на ўвазе сам пошук, уласную ініцыятыву дзіцяці. Творчыя спробы, якія адрозніваюць дзяцей з раннім разумовым уздымам, з'яўляюцца ўласцівасцю дзіцячага мыслення, якая характэрна ўсім дзецям. Іх неабходна заўважаць і любымі сродкамі падтрымліваць, стымуляваць.

Трэба адзначыць, што творчыя здольнасці развіваюцца не толькі праз мэтанакіраваныя педагагічныя уздзеянні, але і пры дапамозе спецыяльна арганізаванага прадметна-прасторавага асяроддзя, адпаведных умовах і фактараў.

У працах вядучых спецыялістаў дзіцячай творчасці, такіх як Б.Н. Нікіціна, Л.П. Бярозавыя, Л.С. Выгоцкі, Н.А. Вятлугіна, былі вылучаныя наступныя ўмовы паспяховага развіцця творчых здольнасцей:

- жаданае дзіця — здаровая псіхіка;
- свабода пазнання свету (з чатырох месяцаў) — „пускавы фактар" для развіцця творчых здольнасцей;
- стварэнне "развіццёвага асяроддзя" для апераджальнага развіцця (з пяці гадоў): майстэрня або працоўны куток ў кватэры (доме), наборы інструментаў, матэрыялы (з двух гадоў);
- ранняе фізічнае развіццё дзяцей;
- выкарыстанне творчых гульняў(з паўтары гадоў);
- самастойны пошук адказу;
- адсутнасць абмежаванняў у выбары дзейнасці (аднак не павінна быць ўсёдазволенасці);
- максімальнае напружанне сіл у працэсе творчасці;
- адсочванне момантуператамлення;
- стварэнне спрыяльнага мікраклімату, сяброўскіх, цёплых узаемін;
- стварэнне ўмоў для свядомай сацыяльна значнай творчасці дзіцяці, праява зацікаўленасці;
- наяўнасць актуальных сітуацый;
- скарачэнне часу навучання [3].

Лічым неабходным акрэсліць асноўныя прыёмы арганізацыі дзейнасці малодшых вучняў на ўроку з улікам развіцця іх здольнасцей:

1. Забеспячэнне спрыяльнай атмасферы. Добразычлівасць з боку настаўніка, яго адмова ад выстаўлення адзнак і крытыкі ў адрас дзіцяці спрыяюць свабоднай праяве дывергентнага мыслення. Напрыклад, пры арганізацыі першага этапа ўрока эфектыўным з'яўляецца выкарыстанне прыёма „Прыплюсуем — аднімем", які накіраваны на актывізацыю разумовай дзейнасці і прыцягненне цікавасці да тэмы ўрока. Прыём „Пытан-

не — роздум“ таксама накіраваны на стварэнне сітуацыі поспеху. Выконваючы заданне, вучань павінен атрымліваць задавальненне ад сваёй дзейнасці. Гэта дазваляе ўтрымліваць увагу вучня і замацоўвае цікавасць да ўрока. Прыём тэхналогіі вырашэння вынаходніцкіх задач (ТВВЗ) „Так – не“ ставіць навучэнцаў у актыўную пазіцыю.

2. Узбагачэнне навакольнага асяроддзя дзіцяці самымі разнастайнымі для яго прадметамі і стымуламі з мэтай развіцця яго дапытлівасці. Уладкоўваючы развіваючае асяродзе для навучэнцаў, неабходна паклапаціцца аб наяўнасці ў класе развіваючых гульняў, самаробных цацак-галаваломак, незвычайных прадметаў. Напрыклад, блокі Дзьенеша дапамагаюць дзецям развіць прасторавае ўяўленне, творчыя здольнасці, фантазію, навыкі канструявання і мадэлявання, маўлення, самастойнасць.

3. Заахвочванне да выказванняў арыгінальных ідэй. Неабходна як мага больш ствараць нестандартных сітуацый на ўроку і далучаць дзяцей да знаходжання розных выйсцяў з іх. Добра прапаноўваць пытанні-жарты. Напрыклад, да якога каўнерыка нельга прышыць гузікі?

4. Забеспячэнне магчымасцей для практыкаванняў і практыкі. Шырокае выкарыстанне рознабаковых пытанняў дывергентнага тыпу. Напрыклад, заданне “Аповед на зададзеную тэму” ці “Раскажыце гэта іншымі словамі”, пытанні тыпу: што было б, калі б мы маглі чытаць чужыя думкі?

5. Выкарыстанне асабістага прыкладу творчага падыходу да вырашэння праблем. Пры рашэнні задач-галаваломак, рэбусаў, займальных задач, задач на кемлівасць навучэнцам часцей за ўсё даводзіцца карыстацца метадам спроб і памылак, што, у канчатковым выніку, развівае інтуіцыю, творчасць, здольнасць шукаць іншы спосаб рашэння, адмовіўшыся ад памылковага шляху. Пошук вырашэння такіх задач выхоўвае ўседлівасць, развівае розныя віды памяці, увагу. Для развіцця творчага мыслення ў вучняў часцей прапануйце ім заданні тыпу: “Што здарыцца, калі ...“

- знікнуць камары;
- перастануць ісці дажджы;
- людзі высякуць лясы і г.д.

6. Прадастаўленне дзецям магчымасці актыўна задаваць пытанні. Калі пытанне будзе задаваць дзіця, не спяшайцеся даваць адказ, прапануйце яму самому выказаць здагадку: “А ты як думаеш?” “Пытанне да тэксту” – універсальны прыём, які працуе на павышэнне цікавасці да навучальнага матэрыялу. Фарміруе ўменне змястоўна фармуляваць пытанні, ацэньваць межы сваіх ведаў. Пры правядзенні ўрокаў літаратурнага чытання эфектыўным будзе “Апытанне па ланцужку”. Аповед аднаго вучня перарываецца ў любым месцы, і слова перадаецца другому, трэцяму і т.д. жэстам настаўніка і так да завяршэння адказу. Гэта мэтазгодна ў выпадку, калі прапануецца разгорнуты, лагічна складны адказ. Гэтая форма апытання добра развівае гаворку вучня.

7. У час размовы, абмеркавання прытрымліванне логікі дзіцяці, без навязвання свайго меркавання. Напрыклад, па тэме “Геаметрычныя фігуры” можна прапанаваць дзецям наступнае заданне: “Намаляваны тры кругі, зрабіце з іх два. Пры гэтым, не закрэсліваючы іх і не сціраючы”. Галоўнае – даць магчымасць дзецям самім выканаць гэтую задачу, г.зн. не спяшацца ім падказаць адказ. Ці такое заданне: параўнайце словы вужы, мышы, маржы і знайдзіце агульныя прыкметы, а таксама лішняе слова.

8. Немагчымасць негатыўнага ацэньвання пастаўленых пытанняў, якімі б недарэчнымі яны ні здаваліся. У дзіцяці павінна быць як мага больш стымулаў задаваць вам пытанні. Часцей кажыце сваім вучням: “Цікава, незвычайна, арыгінальна, дзіўна, як добра!“

9. Навучанне дзяцей аргументавана пярэчыць настаўніку і адзін аднаму, пярэчыць доказна, прапаноўваючы нешта наўзамен.

10. Выкарыстанне актыўных форм навучання — групавыя дыскусіі, “мазгавыя штурмы“, ролевыя гульні, групавыя і індывідуальныя праекты. Напрыклад, пры складанні загадкі па вызначаным алгарытме (хто? або што? які? што робіць?) можна дзяцей аб'яднаць у пары ці групы для сумеснай працы. Добра выкарыстоўваць групавую або франтальную форму пры складанні казак, гісторый, апавяданняў.

11. Выкарыстанне памылак дзіцяці як нечаканага погляду на нешта звыклае і як спосаб пошуку ісціны. Выкарыстоўвайце дыдактычную гульню „Карэктар“, уключаючы ў дзейнасць дзяцей, дапамагаючы ім знайсці ісціну.

12. Падштурхоўванне дзіцяці да актыўнасці пры дапамозе пытанняў, каб у іх былі элементы невядомага і супярэчлівага, каб яны ў большай ступені былі накіраваны на мысленне (пошук прычын, узаемасувязі) і ў меншай ступені — на прайграванне. Творчыя заданні, прыёмы тыпа „Шыфравальшчык“, „Знайдзі прыказкі і прымаўкі“, „Наборшчык“ з'яўляюцца сродкамі развіцця пазнавальнай актыўнасці, раскрываюць індывідуальнасць і “схаваныя” здольнасці дзіцяці, надаюць яму самабытнасць і ўнікальнасць.

Дзіцячы ўзрост мае найбагацейшыя магчымасці для развіцця творчых здольнасцей. Нажаль, гэтыя магчымасці з цягам часу незваротна губляюцца, калі не атрымліваюць свайго развіцця. Таму неабходна як мага больш эфектыўна іх выкарыстоўваць у перыяд самага ранняга дзяцінства. Набольш важнымі сродкамі развіцця навучэнцаў пачатковых класаў з'яўляюцца творчыя заданні, развіццёвыя гульні, дыдактычныя гульні, накіраваныя на развіццё дывергентнага мыслення, гнуткасці, бегласці мыслення, творчага ўяўлення, калектыўнай мастацкай дзейнасці, розных відаў мастацтва, гульняў-драматызацый.

Зацікаўлены настаўнік заўсёды знойдзе час і магчымасці для мэтанакіраванага развіцця творчых здольнасцей дзяцей, бо кожнае дзіця па-свойму таленавітае і чакае толькі нашай дапамогі. Развітае творчае ўяўленне і мысленне дзіцяці паспрыяюць удасканаленню здольнасці максімальна хутка і арыгінальна вырашаць любыя задачы, атрымліваць радасць ад разумовага працэсу, ад творчасці.

Здольнасць дзіцяці да самаразвіцця, яго творчая актыўнасць — галоўныя ўмовы паспяховасці ў далейшым жыцці. Калі дзіця ў школе не навучыцца самастойна тварыць, то ў будучым яго чакае стан безыніцыятыўнасці, пасіўнасці. Маленькі вучань добра вучыцца толькі тады, калі перажывае поспех, хоць і невялікі. Таму варта з першых дзён сустрэчы з дзецьмі выявіць іх магчымасці, развіваць творчыя здольнасці, схільнасці, інтарэсы [2].

Антуан дэ Сэнт-Экзюперы лічыў: „Гліна, з якой ты злеплены, высахла і зацвярдзела, і ўжо ніхто і ніхто на свеце не здолее абудзіць у табе заснулага музыканта ці паэта, або астранома, які, можа, жыў калісьці ў табе“. У гэтых словах — заклік і папярэджанне: трэба фарміраваць чалавека, пакуль розум дзіцяці гнуткі і сам ён успрымальны да ўсяго адкрытага перад ім багацця свету.

### Спіс літаратуры

1. Коджаспиров, А.Ю. Педагогический словарь: Для студ. высш. и сред. пед. учеб. заведений / А.Ю. Коджаспиров, М.Г. Коджаспирова. — М.: Издательский центр «Академия», 2003. — 176 с.

2. Поддьяков, А.Н., Развитие исследовательской инициативности в детском возрасте: дисция д-ра психол.наук. — М.: Ф-т психологии МГУ, 2001. — 350 с.

3. Пономарев, Я.А. Перспективы развития психологии творчества / Я.А. Пономарев // Психология творчества; Школа Я.А. Пономарева / Д.В. Ушакова [ред.]. — М.: Институт психологии РАН, 2011. — 631 с.